**ВАЛЫНЦЫ**, вёска ў Верхнядзвінскім р-не, на р. Дрыса (прыток р. Зах. Дзвіна). За 23 км на ПдУ ад г. Верхнядзвінск, 7 км ад чыг. ст. Свольна на лініі Полацк—Даўгаўпілс (Латвія), 152 км ад Віцебска. Цэнтр Валынецкага с/с. 350 гаспадарак, 812 ж. (2011).

У 18 ст. тут знаходзіўся Забельскі калегіум пры езуіцкім кляштары. У калегіуме дзейнічаў школьны тэатр. З 1772 у складзе Рас. імперыі пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай. У 1904 мястэчка ў Філіпоўскай воласці Дрысенскага пав. Віцебскай губ., 84 двары, 445 ж., слабада на 31 двор, 141 ж., і пагост Забелы, 3 двары, 15 ж., праводзіліся кірмашы. З 20.8.1924 цэнтр Валынецкіх сельсавета і р-на ў Полацкай акрузе. З 9.3.1929 у Боркавіцкім, з 8.7.1931 — Дрысенскім раёнах. З 20.2.1938 у Віцебскай вобл. У 1935 — 196 двароў. У Вял. Айч. вайну з пач. ліп. 1941 да пач. ліп. 1944 акупіравана. З 20.9.1944 да 8.1.1954 у Полацкай вобл. З 25.12.1962 у Верхнядзвінскім р-не. У 1995 — 394 гаспадаркі, 990 ж.

У 2011 дзіцячы сад, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, бальніца сястрынскага догляду, урачэбная амбулаторыя, аптэка, комплексны прыёмны пункт, аддз. сувязі і «Беларусбанка», 4 магазіны. Музей геолага, географа, даследчыка Сібіры І.Дз.Чэрскага, які нарадзіўся ў раёне. Брацкая магіла сав. воінаў, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну. Помнік ландшафтнай архітэктуры — прысады дамініканскага кляштара (канец 16 — пач. 17 ст.).

**ВАЛЫ́НЧЫК** Антон Міхайлавіч (18.7.1896, в. Мялькапавічы Слонімскага р-на — 13.11.1985), беларускі харавы дырыжор, кампазітар. Засл. дзеяч культуры Беларусі (1964). Скончыў Вышэйшыя муз. курсы Варшаўскай кансерваторыі пры Крамянецкім муз. ліцэі (1935). Да 1939 выкладаў спевы ў Клецкай і Навагрудскай гімназіях, арганізаваў аматарскія хары. З 1947 хормайстар Маладзечанскага абл. ансамбля песні і танца, з 1961 Гродзенскага нар. ансамбля песні і танца «Нёман», у 1965—71 кіраўнік Гродзенскай нар. харавой капэлы настаўнікаў. Адначасова ў



*А.М.Валынчык.*

1961—76 заг. кафедры музыкі і спеваў Гродзенскага пед. ін-та. Аўтар хароў і песень, у т.л.: «А зязюлька кукавала», «За праўду», «Зайшло ўжо сонейка», «Устань ты, старонка» на вершы Я.Купалы, «Касцы», «Ліпы старыя», «Устаньце, хлопцы» на вершы Я.Коласа.

**ВА́ЛЬМА**, трохвугольны схіл ад канька да карніза, элемент 4-схільнага даху. Утвараецца дыяганальнымі кроквамі ці страпіламі, якія злучаюць тарэц вільчаковага бруса з вугламі сцен будынка. У Беларусі пры стварэнні В. звычайна выкарыстоўвалі каркасныя канструкцыі, на Прыпяцкім Палессі былі вядомы рубленыя варыянты («у рэж»). В. ўзбагачала сілуэтную кампазіцыю будынка і дазваляла атрымаць форму даху, якая эфектыўна супрацьстаяла ўздзеянню ветру, што было важна для пакрыцця з саломы, чароту, дранкі, гонты. Выкарыстоўвалася ў творах нар. дойлідства (хаты, гасп. пабудовы) і манумент. будынках. Вядомы варыянты вальмавых дахаў («з прычолкам», «з залобкам», «з дымнікам»), у якіх В. не даходзіла да верху або нізу даху. *С.А.Сергачоў.*

**ВАЛЬНАДУ́МСТВА**, ідэйна-філасофская плынь, заснаваная на прызнанні права розуму на свабоднае крыт. стаўленне да рэлігіі, адмаўленне рэліг. вучэнняў і абрадаў ва ўмовах дамінавання царквы і рэліг. светапогляду. Звязана з паняццем свабоды сумлення; адстойвае права на крытыку існуючых парадкаў і поглядаў. Як гіст. феномен культуры В. ўзнікла на аснове рацыяналістычных ведаў пра свет і чалавека. Адкрытае сцвярджэнне права чалавека на свабоду думкі было вылучана ў еўрап. філасофіі Новага часу (Б.Спіноза, Дж.Толанд). Паняцце «В.» распаўсюдзілася пасля з'яўлення работы Э.Колінза «Разважанне пра вальнадумства, што выклікана ўзнікненнем і развіццём секты пад імем «Свабодамысныя» (1713), дзе ён абвясціў: «Свабодна думаць аб рэлігійных пытаннях — абавязак усіх людзей». Формы і праяўленні В. — багаборніцтва, антыклерыкалізм, скептыцызм, гуманізм, рэліг. індыферэнтызм, пантэізм, дэізм, натуралізм, матэрыялізм, рацыяналізм, ерасі, *атэізм* і інш. Найб. пашырылася ў асветніцкай думцы. У Беларусі перадумовы В. склаліся ў 11—12 ст. і праявіліся ў фальклоры і тагачасных помніках пісьменства; пазней — у філас. і грамадска-паліт. думцы. У ератычных вучэннях гусітаў сустракаюцца элементы В.: крытыка царквы, духавенства, рэліг. абраднасці. Дзейнасць бел. першадрукара, гуманіста і асветніка Ф.Скарыны вылучалася імкненнем узвысіць чалавечы розум, узбагаціць яго біблейскай мудрасцю, дасягненнямі антычнай культуры. У гуманіст.-асветніцкім кірунку В. развівалася ў творчасці С.Буднага, В.Цяпінскага, Л.Зізанія. Атэістычныя ідэі ўвасобіліся ў поглядах К.Бекеша і С.Лована. Яскравае праяўленне В. 17 ст. — трактат К.Лышчынскага «Аб неіснаванні бога». Бел. вальнадумцы стваралі парадыйныя і сатыр. ананімныя творы, у якіх парадзіравалі біблейскія сюжэты, крытыкавалі царк. ўлады, абаранялі нац. культуру і мову (*«Прамова Мялешкі»*, *«Ліст да Абуховіча»*, *«Казане руске схізматычнэ»*, *«Энеіда навыварат»*, *«Тарас на Парнасе»* і інш.). Антыклерыкальны кірунак у ананімных творах «Маё жыццё», «Дабрачынны цыган», «Падтрымка», «Роздум над жыццём Я.Замойскага», сатыры «Пісьмо сельскага жыхара да прыдворнага» Макульскага, пародыях «На гарадзенскі сойм» і «Фрагмент тарговіцкай Біблії» Ю.Нямцэвіча. Пад уплывам прыродазнаўча-навук. думкі паступова разбуралася традыц. біблейская карціна свету. У канцы 19 ст. В. стала элементам рэв.-дэмакр. ідэалогіі. У далейшым арганізоўвалася ў нац. і сусв. саюзы, у т.л. Сусв. саюз свабодамысных (1880), Міжнар. гуманіст. і этычны саюз (1952), дзей-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

насць якіх была скіравана на крытыку рэлігіі, антыклерыкалізм, абарону свецкай маралі, гуманізму, барацьбу за свабоду сумлення, свецкую адукацыю, супраць войнаў, эксплуатацыі чалавека чалавекам. Сучасныя прынцыпы В. замацаваны ў заканадаўчых гарантыях свабоды сумлення і веравызнання.

*В.Р.Языковіч.*

**ВАЛЬТЭ́Р** (Voltaire; сапр. Франсуа Мары Аруэ; Arouet; 21.11.1694, Парыж — 30.5.1778), французскі пісьменнік, філосаф, гісторык, публіцыст, адзін з прадстаўнікоў франц. Асветніцтва. Скончыў езуіцкі каледж. Чл. Франц. акадэміі (1746). Выступаў за прагрэс грамадства і адукацыю, роўнасць грамадзян перад законам, дэмакр. свабоды. Аўтар філас. твораў «Філасофскія пісьмы» (1733), «Трактат пра метафізіку» (1734), «Сакрат» (1759), «Філасофскі слоўнік» (1764—69), гіст. прац «Нарыс пра норавы і дух народаў» (1756), «Гісторыя Расійскай імперыі ў царстванне Пятра Вялікага» (1759—63) і інш. Літ. дэбют — трагедыя «Эдып» (паст. 1718), рымскія трагедыі «Брут» (паст. 1730), «Смерць Цэзара» (паст. 1735). Выкрыццю рэліг. нецярпімасці, фанатызму прысвечаны трагедыі «Заіра» (паст. 1732), «Фанатызм, або Магамет-прарок» (паст. 1742). Пісаў філас. аповесці («Кандыд, або Аптымізм», 1759; «Прастадушны», 1767), паэт. творы («Арлеанская нявінніца», 1735; «Вавілонская прынцэса», 1768). У Беларусі творы В. вядомы з 18 ст. ў арыгіналах і перакладах на польск. і рус. мовы. У 1776 у Гродне на польск. мове выдадзена філас. аповесць «Задыг, або Лёс» пад назвай «Усходняя гісторыя пра Задыга», у якой з'едліва высмеяны забабоны дваранства і рэліг. нецярпімасць. У 1793 у Вільні ў перакладзе на польск. мову выйшаў адзін з найб. вядомых гіст. твораў В. — «Век Людовіка XIV». П'есы В. ставіліся ў тэатрах Вільні, Нясвіжа, Слоніма і інш. Ідэі В. прапагандавалі бел. мысліцелі К.Багуслаўскі, **Ф.Галянскі**, І.Лялевель, філаматы. Цікавасць да літ. і філас. творчасці В. ў Беларусі тлумачыцца тым, што ён у сваіх брашурах рэзка крытыкаваў фанатызм каталіцкай царквы, што панавала ў Рэчы Паспалітай, выкрываў жорсткія ганенні на пратэстантаў і праваслаўных. У 1781 у Нясвіжы выйшла кн. «Жыццё і памылкі Вальтэра» — скарочаны пераклад на польск. мову паклёпніцкага твора абата К.Нанота «Памылкі Вальтэра». Аналагічны характар мела кніга праф. багаслоўя з Жэневы Ж.Вернэ «Філосаф без рэлігіі...», выдадзеная ў Вільні ў 1786. Магілёўскі архіепіскап Г.Каніскі выступаў супраць гэтага антыклерыкальнага твора, які пад назвай «Пісьмо Вальтэра» распаўсюджваўся ў Беларусі ў 2-й пал. 18 ст.

*Тв.*: Рус. пер. — Философские сочинения. М., 1996; Философские повести. Философские письма. М., 2004.

*В.М.Іўчанка.*

**ВАЛЬФСО́Н** Сямён Якаўлевіч (8.6.1894, г. Бабруйск — 1941), беларускі філосаф. Акадэмік НАН Беларусі (1928), праф. (1921). Скончыў Кіеўскі ун-т (1919). З 1921 у БДУ. У 1931—38 дырэктар Ін-та філасофіі і права, адначасова з 1936 акадэмік-сакратар Аддз. грамадскіх навук АН Беларусі. У 1936—37 адначасова намеснік гал. рэд. Гал. рэдакцыі Бел. Сав. Энцыклапедыі. Даследаваў пытанні гісторыі філасофіі, праблемы сям'і і шлюбу, навукі і культуры, стан рэліг. жыцця ў Беларусі, гісторыю сямейных адносін. Чл. ЦВК БССР у 1929—38.

**ВАЛЭ́ЙКАВІЦКІ ДОМ ФАЛЬКЛО́РУ**. Засн. ў 1994 у в. Валэйкавічы Смаргонскага р-на як музей фальклору, з 1995 сучасная назва. Мае ткацкую майстэрню, фалькл. гасцёўню. Пры ўстанове працуюць калектывы: *Валэйкавіцкі народны фальклорны гурт «Валэйчанка»*, *Валэйкавіцкі ўзорны тэатр народнай песні «Кропелькі»*.

**ВАЛЭ́ЙКАВІЦКІ НАРО́ДНЫ ФАЛЬКЛО́РНЫ КАЛЕКТЫ́Ў «ВАЛЭЙЧА́НКА»**. Створаны ў 1976 у в. Валэйкавічы Смаргонскага р-на пры сельскім клубе (з 1995 Дом фальклору). У 1991 прысвоена званне «народны аматарскі калектыў». Кіраўнік М.С. Будзько. У складзе калектыву 10 чал. ва ўзросце ад 40 да 71 гадоў. У рэпертуары песні быт., жартоўныя, абрадавыя, карагоды «Як я молада была», «Траўка-мураўка», танец «Ланчык» і інш., канцэртная праграма «З куфэрка бабулі Гані», у аснове якой фалькл. матэрыял, запісаны ад мясц. жыхаркі Г.І.Стурліс. У аўтэнтычнай манеры ўдзельнікі выконваюць песні «Марыня», «У Марцінавым саду», «Чэраз бор зялёненькі», «А ўжо сонейка за лес коціцца», «Ці свет, ці світае», «Ці я ў маці не дачка», «Пойду я да броду», «Ходзіла-блудзіла сіротка одна» і інш. Адноўлены абрады «Калядкі», «Вялікдзень», «Сустрэча вясны», «Вяселле», «На дажынкі да Дзядка». Калектыў — лаўрэат фестываляў: міжнар. фальклору «Палескі карагод» (г. Пінск, 1994), рэсп. фалькл. мастацтва «Берагіня» (г.п. Акцябрскі, 2004), дыпламант усебел. фестывалю нар. мастацтва «Беларусь — мая песня» (1998), удзельнік рэсп. фестывалю нац. культур (г. Гродна, 2000) і



*Валэйкавіцкі народны фальклорны калектыў «Валэйчанка».*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ